*А. В. Щитцова, аспирант.*
*Научный руководитель – Ю. П. Бондарь,*
*кандидат политических наук, доцент*

# ПРАВОВАЯ КУЛЬТУРА И ИНТЕРНЕТ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сегодня в Беларуси происходит очередной этап научно-технической революции – становление информационного общества, основными чертами которого являются ускорение темпов развития техники, автоматизация обработки информации, создание новых интеллектуальных технологий, превращение информации в важнейший глобальный ресурс человечества.

По оценкам специалистов, количество пользователей сети Интернет в Беларуси достигло 51%. Общение в социальных сетях, использование мирового банка научной и художественной литературы, музыки, кино, современных образовательных программ, новостных сайтов и компьютерных технологий прочно вошли в нашу жизнь. Таким образом, Интернет стал важной частью культуры современного белорусского общества.

Влияние Интернета на аудиторию огромно. Пользователи обмениваются информацией, советами, налаживают связи, получают свежие новости в режиме онлайн. Интернет стирает границы между странами и людьми, открывая неисчерпаемые возможности. Развитость информационных систем, в том числе Интернета как международной телекоммуникационной информационной сети, приводит к тому, что новости практически мгновенно становятся достоянием больших масс людей, оказывают серьезное воздействие на формирование обыденного сознания. Являясь средством массовой информации, Интернет может оказывать как позитивное, так и негативное воздействие на людей, формируя не только определенное отношение к процессам,

происходящим в стране и мире, в зависимости от точки зрения авторов и направленности публикуемых статей, но также вызывая состояние неопределенности на уровне оценки текущей информации. Данное обстоятельство дает повод ряду ученых рассматривать информационные технологии, в том числе Интернет, в качестве «консциентального оружия», под которым понимается такая технология работы с сознанием, которая нацелена на поражение и уничтожение определенных форм и структур сознания, а также некоторых режимов его функционирования. Это предполагает:

1) понижение общего уровня сознания людей, живущих на определенной территории;

2) разрушение у них устойчивой системы мировоззренческих ценностей и как следствие – уничтожение родовой и культурной памяти людей, психотизация и невротизация общества;

3) разрушение традиционных механизмов самоидентификации, внедрение в общество специально конструируемой матрицы ценностей норм поведения и реакций как единственно возможной модели жизнедеятельности населения;

4) уничтожение способности ставить глобальные и стратегические цели.

Особенно остро проблема негативного влияния на умы людей стоит в странах в период общественной трансформации, когда происходит разрушение духовных устоев, моральных норм и принципов, меняются цели, ценности, допустимые средства реализации социальных потребностей, в обществе устанавливаются новые правила правового и экономического взаимодействия. Перечисленные факторы ведут к кардинальному, многоуровневому изменению культурной, политической, правовой жизни социальной среды, выдвигают проблему поиска национальной идеи и национального самосознания, формирования гражданско-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

патриотических чувств в обществе, веры в государственный строй и справедливость, что является основой формирования правовой культуры в обществе.

Правовая культура представляет собой часть культуры общества как исторически сложившейся системы общечеловеческих духовно-нравственных ценностей, в соответствии с которыми формируется образ жизни и осуществляется социальная регуляция отношений между людьми. Правовая культура как система духовно-нравственных и правовых ценностей выражается в достигнутом уровне развития правовой действительности, нормативных правовых актах, правосознании, в соответствии с которыми формируется законопослушный образ жизни и осуществляется правовое регулирование общественных отношений, устанавливающих режим правопорядка в стране.

Правовая культура – неотъемлемая часть общей культуры народа, базируется на ее началах и является отражением уровня ее развития, менталитета народа.

Все влияние, которое оказывает Интернет на процесс формирования правовой культуры, можно разделить на пять составляющих. Следует отметить, что некоторые из них характеризуются наличием ярко выраженной обратной связи, позволяющей говорить о взаимовлиянии Интернета и правовой культуры.

В качестве первой составляющей этого влияния можно назвать формирование культуры информационного общества. Данная составляющая подробно освещена в диссертационном исследовании Е. И. Пахомова «Социокультурные основания и механизмы формирования современной правовой культуры».

Вторая составляющая связана с процессами изменения взаимоотношений между государством и обществом, государством и личностью; изменения функций государства, демократии в современном обществе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Третья составляющая основана на появлении новых общественных отношений, возникающих в связи с функционированием Интернета, трансформации общественных отношений в основных сферах общественной жизни (производства, потребления, развлечения, образования, общения). Интернет существенно влияет на становление информационного образа жизни, который требует правового регулирования, а это, в конечном счете, ведет к изменению и правовой культуры.

Четвертая составляющая влияния Интернета связана с изменениями в способах хранения, передачи и использования правовой информации. В этом случае изменение правовой культуры связано с процессом функционирования Интернета как источника правовой информации.

Пятая составляющая характеризуется изменениями в сфере правового образования.

Процесс перехода к современному, информационному обществу является в Беларуси одним из решающих факторов, влияющих на формирование правовой культуры и правового сознания нации. Влияние Интернета на правовую культуру граждан представляет собой процесс и результат изменения Интернетом позиций, оценок и установок гражданина, т. е. качественную модификацию правовой культуры личности. В последние годы правовая активность граждан заметно повысилась, причиной чего, безусловно, стали доступность правовой информации, образования и информирование граждан о процессах, происходящих в стране. Этот поворот в развитии правовой культуры граждан отражает позитивные тенденции, связанные с развитием сети Интернет в нашей стране, несмотря на сохраняющийся высокий уровень правового нигилизма населения.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. *Боер, В. М.* Правовая информированность и формирование правовой культуры личности (вопросы теории) : дис. … канд. юр. наук / В. М. Боер. – СПб., 1993. – 132 с.

2. *Семитко, А. П.* Правосознание и правовая культура / А. П. Семитко // Теория государства и права / отв. ред. В. Д. Перевалов. – М., 2007. – 541 с.

3. *Лебедева, Н. Н.* Право. Личность. Интернет / Н. Н. Лебедева. – М. : Волтерс Клувер, 2004. – 232 с.. *І. Шык, аспірант.*
*Навуковы кіраўнік – В. М. Наумчык,*
*доктар педагагічных навук, прафесар*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## *ВОЛЬНЫ ЧАС І АСАБЛІВАСЦІ ЯГО ВЫКАРЫСТАННЯ НАВУЧЭНЦАМІ Ў СУЧАСНАЙ САЦЫЯКУЛЬТУРНАЙ СІТУАЦЫІ*

Даследаванне вольнага часу навучэнцаў абумоўлена патрабаваннямі грамадства ў станаўленні гарманічна развітай асобы. Менавіта ў вольны час рэалізуюцца многія сацыякультурныя патрабаванні, якія фарміруюць духоўнае аблічча маладога чалавека.

Для разумення сутнасці вольнага часу звернемся да азначэнняў гэтага паняцця. Г. А. Прудзенскі пад вольным часам разумее «свабодны ад працы час, прызначаны для фізічнага і інтэлектуальнага развіцця і адпачынку» [3, с. 251]. Звернем увагу на тое, што да гэтага азначэння варта дадаць, што вольны час – гэта не толькі свабодны ад працы час, але і свабодны ад хатніх і іншых спраў. Р. Н. Азарава падкрэслівае дзейнасны аспект гэтага паняцця: «вольны час як аб’ектыўна існуючы кавалак часу, у сярэдзіне якога перасякаюцца розныя віды дзейнасці, той час, які суб’ектыўна ацэньваецца чалавекам як прыналежны яму і які напаўняецца мэтанакіраванай карыснай дзейнасцю» [1, с. 28]. Аднак неабходна звярнуць увагу на той факт, што вольны час не заўсёды

запаўняецца карыснай дзейнасцю, паколькі ў ім перасякаюцца розныя віды дзейнасці, якія не заўсёды могуць быць карыснымі. У сваю чаргу, Я. Д. Грыгаровіч, А. І. Смолік вызначаюць вольны час «як той час у жыцці чалавека, калі ён можа жыць натхнёна, без турбот аб хлебе надзённым, можа прыўзняцца над паўсядзённасцю, адчуць узлёт свайго духу, пазнаць прываблівасць разнастайнасці» [2, с. 131].

Такім чынам, зыходзячы з гэтых азначэнняў, можна сказаць, што пад вольным часам мы разумеем той час, які застаецца ў чалавека пасля яго асноўнай дзейнасці, у прыватнасці, у навучэнцаў – пасля заняткаў і ўсіх працэсаў, з імі звязаных: падрыхтоўкі хатніх заданняў, чытання дадатковай літаратуры і г. д. Прычым у структуры вольнага часу можна вылучыць актыўную творчую дзейнасць, культурнае спажыванне (чытанне газет, наведванне кіно, прагляд тэлепраграм і г. д.), самаадукацыю, спорт, розныя віды хоббі і г. д. Вольны час можа быць як дзейсным, так і пасіўным, карысным і шкодным – у залежнасці ад таго, праводзіць навучэнец яго дома альбо па-за яго межамі, нічога не робіць, проста адпачывае альбо зацікаўлены пошукам карыснай інфармацыі, наведвае розныя гурткі, аб’яднанні альбо «тусуецца», бо вольны час – гэта выбар, які заснаваны не толькі на ўласных традыцыях, густах і перавагах, але і на распаўсюджаных тэндэнцыях, модзе.

Пры гэтым варта адзначыць велізарныя магчымасці дзейснага вольнага часу ў забеспячэнні рэкрэацыі шляхам змены аднаго віду занятку, які стаміў чалавека, на іншы, той, які адрозніваецца ад ранейшага; ролю вольнага часу ў пашырэнні дыяпазону жыццядзейнасці навучэнцаў, а таксама ў іх усебаковым развіцці. Дзейсны вольны час – гэта непасрэднае ўключэнне асобы ў культурна-творчы працэс, пераход ад спажывецкай да прадукцыйнай, канструктыўнай дзейнасці ў сітуацыі вольнага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выбару яе пэўных відаў, якія адпавядаюць здольнасцям, задаткам і захапленням чалавека.

Асноўнай асаблівасцю выхавання ў вольны час з’яўляецца ўзнікненне пэўных цяжкасцей з далучэннем моладзі да яго актыўна-дзейснага выкарыстання, таму вельмі важна высветліць інтарэсы навучэнцаў, каб лепш і эфектыўна арганізаваць выхаваўчую работу з улікам іх захапленняў.

Для больш дакладнага вызначэння спецыфікі выхавання ў вольны час варта вызначыць прыярытэты навучэнцаў у ім, якія фарміруюцца пад уплывам сённяшняй сацыяльна-культурнай сітуацыі, каштоўнасці, на якія арыентавана дадзеная ўзроставая катэгорыя. Для аналізу-агляду сённяшніх прыярытэтаў навучэнцаў звернемся да сацыялагічнага даследавання па выбары форм вольнага часу, якое было намі праведзена на базе школ і каледжаў горада Мінска ў 2011 г., у якім удзельнічала 300 чалавек і былі загаддзя пазначаны адпачынкавыя кірункі, якія выбіралі навучэнцы.

Навучэнцам было зададзена пытанне: «Як вы праводзіце свой вольны час?» Адказы былі наступнымі: дыскатэку абралі 69%; «тусоўкі» – 51; чытанне кніг – 15,3; заняткі спортам – 14,9; наведванне бараў – 12,6; вечары адпачынку ў клубах – 7,8; нетрадыцыйныя формы вольнага часу – 7,4%; сямейны вольны час – 5,1; правядзенне часу ў адзіноце – 4,9; розныя віды мастацтва – 3,1; мастацкую самадзейнасць – 2,1; удзел у грамадскіх рухах – 0,5; наведванне царквы – 0,5%.

Атрыманыя адказы паказваюць перавагу ў вольным часе такіх форм дасугу, як дыскатэкі (69%) і «тусоўкі» (51%), што сведчыць пра хібы ў справе выхавання культуры вольнага часу ў сям’і і ўстановах адукацыі. Іншыя перавагі маюць мінімальнае

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адрозненне, што таксама схіляе да думкі аб тым, што роля традыцыйных адпачынкавых форм рэзка знізілася.

Выяўленне пераважных форм вольнага часу мае значэнне для ўдакладнення структуры, метадаў і форм выхавання навучэнцаў. Пастаўленыя пытанні былі накіраваны на выяўленне разумення ролі вольнага часу ў сучасным грамадстве.

У цэлым можна адзначыць, што ў сферы вольнага часу моладзі на сёння найболей выразна выяўляюцца наступныя тэндэнцыі: адступленне ад культурных нацыянальных традыцый у арганізацыі і правядзенні вольнага часу; узмацненне нарматыўнай аўтанамізацыі маладых людзей, калі яны кіруюцца сваімі нормамі паводзін, якія складаюць іх асаблівую субкультуру; змененае разуменне сутнасці вольнага часу; дамінаванне спажывецкіх форм выкарыстання вольнага часу; нарастанне статусна-прэстыжных інтарэсаў у рэалізацыі вольнага часу.

Адным з чыннікаў, якія спарадзілі гэтыя тэндэнцыі, з'явілася разбурэнне традыцыйных інстытутаў сацыялізацыі маладога пакалення. Такое становішча спраў у сферы вольнага часу востра ставіць пытанне аб неабходнасці яго рэгулявання і належнага напаўнення, якое б адпавядала эстэтычным, этычным і агульнакультурным каштоўнасцям. Яго рашэнне павінна адбывацца з улікам таго, што павышэнню якаснага стану вольнага часу ў велізарнай ступені спрыяюць рост матэрыяльнага стану насельніцтва, развіццё і арганізацыя сацыяльнай інфраструктуры, выхаванне актыўнага каштоўнаснага стаўлення людзей да ўзораў духоўнай культуры, яе ўсебаковае засваенне.

Такім чынам, асаблівасці выхавання навучэнцаў у вольны час заключаюцца ў тым, што ў гэтым узросце фарміруецца жыццёвая пазіцыя, усведамляюцца індывідуальныя магчымасці і каштоўнасна-сацыяльныя арыентыры, калі перад навучэнцамі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўзнікае пытанне выбару далейшага жыццёвага шляху. Індывідуальны выбар дадзенай узроставай катэгорыі можа адбывацца ў межах іх прафесійных пераваг, сямейных каштоўнасцей, грамадскіх уплываў і г. д. Аднак гэты выбар можа мець і асацыяльную накіраванасць, весці да разбурэння асобы, крыміналагізацыі грамадства. Улічваючы той аспект, што навучэнец сам выбірае прыярытэты дзейнасці ў вольны час, узнікае пытанне, як яго зацікавіць і дапамагчы павярнуцца да культурна-адпачынкавай сферы, выпрацаваць патрэбу ў духоўна-маральных і патрыятычных арыентырах, распрацаваць дзейсную сістэму выхавання навучэнцаў з выкарыстаннем усяго арсенала форм, метадаў, якія ўтрымлівае адпачынкавая сацыякультурная дзейнасць.

---

1. *Азарова, Р. Н.* Досуг современной молодежи / Р. Н. Азарова // Внешкольник. – 2003. – № 10. – С. 19–21.

2. *Грыгаровіч, Я. Д.* Прыкладная культуралогія / Я. Д. Грыгаровіч, А. І. Смолік. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2005. – 215 с.

3. *Пруденский, Г. А.* Проблемы рабочего и внеробочего времени / Г. А. Пруденский. – М. : Наука, 1972. – 223 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ